**Рэлігія старажытных егіпцян: урок гісторыі ў 5 класе**

**Л. І. Бык,**

настаўнік гісторыі першай катэгорыі

**Тэма. Рэлігія старажытных егіпцян**

**Мэты:**

- ❐ стварыць умовы для паспяховага азнаямлення вучняў з вераваннямі старажытных егіпцян, найбольш шануемымі багамі;
- ❐ садзейнічаць развіццю ўмення вызначаць падабенствы і адрозненні паміж вераваннямі старажытных егіпцян і першабытных людзей, развіццю мыслення, гістарычнай памяці;
- ❐ праз рэлігійныя ўяўленні старажытных егіпцян выхоўваць маральныя якасці вучняў.

**Сродкі навучання**: карта «Егіпет і Пярэдняя Азія ў старажытнасці», выявы багоў, атласы, карткі з заданнямі.

**Ход урока**

**І. Арганізацыйны момант**

**Настаўнік.** Добры дзень! Падыміце рукі, хто сёння прыйшоў на ўрок з добрым настроем. А цяпер, хто не з вельмі добрым. А каму сёння зусім не хацелася ісці ў школу? Усміхніцеся адзін аднаму, падарыце добры настрой, і пачнем працаваць.

**ІІ. Праверка дамашняга задання**

***Прыём «Лаві памылку»***

<u>Выправіць памылкі ў сказах</u>

1. Рабочы дзень рамесніка доўжыўся прыкладна 10 гадзін.
2. Паводле падлікаў вучоных, нерабочых дзён налічвалася да 60 ў год.
3. Простыя егіпцяне жылі ў раскошных палацах.
4. Простыя людзі насілі адзенне такога ж фасону, што і багатыя.
5. Сям'я ў Старажытным Егіпце не лічылася каштоўнасцю.
6. Дома егіпцяне хадзілі ў сандалях.

7. Багатыя егіпцяне елі кашы, ячменныя ляпёшкі, агародніну.
8. Дзеці не расставаліся з маці амаль да 6 гадоў.
9. Дзяўчынкі атрымлівалі адукацыю ў школе.
10. Непаслушэнства не асуджалася ні ў сям'і, ні ў грамадстве.

**III. Мэтапакладанне**

**Настаўнік.** Паглядзіце на тэму нашага ўрока і скажыце, што вы сёння будзеце вывучаць.

**IV. Вывучэнне новай тэмы**

<u>1) Актуалізацыя ведаў вучняў</u>

✓ Калі і як узніклі рэлігійныя ўяўленні людзей ў старажытнасці?

✓ Як называюць рэлігію першабытных людзей?

***Прыём «Прывядзі доказ»***

***Заданне:*** даказаць, што рэлігія старажытных егіпцян – гэта мнагабожжа.

<u>2) Работа з тэкстам параграфа, складанне табліцы ў сшытку</u>

***Прыём «Знайдзі вызначэнне»***

**«Багі Старажытнага Егіпта»**

| Імя бога | За што адказваў |
|---|---|
| Ра | бог сонца |
| Нут | багіня неба |
| Сет | злы бог пустыні |
| Асірыс | бог прыроды і расліннасці, бог падземнага царства |
| Бастэт | багіня-кошка, ахоўвала ўраджай |
| Сабек | бог-кракадзіл, уладар мёртвых цел |
| Тот | бог мудрасці і пісьма |
| Хапі | бог Ніла |

<u>3) Гутарка па табліцы</u>

✓ Якія багі былі найбольш шануемымі ў Егіпце? Чаму?

- ✓ Чаму егіпцяне пакланяліся Нілу як богу?

4) Фізкультхвілінка

5) Работа са слоўнікам

- ✓ Значэнне паняцця «храм» (с. 120).

6) Самастойная работа з тэкстам: п. 1, с. 49–50, 3–4 абзацы

- ✓ Апісаць знешні і ўнутраны выгляд храма, карыстаючыся тэкстам і ілюстрацыямі на ст. 4 атласа.

7) Работа з дадатковым матэрыялам «Паданне аб Асірысе»

- ✓ Чаму старажытныя егіпцяне, паказваючы Асірыса, заўсёды афарбоўвалі яго ў зялёны колер?

8) Работа з ілюстрацыяй на ст. 50 «Суд Асірыса», дадатковы матэрыял «Паданне аб царстве мёртвых»

- ✓ Як павінен быў жыць чалавек, каб, трапіўшы на суд Асірыса, не быць з'едзеным страшнай пачварай?

9) Работа з тэкстам: п. 3, абзац 2

- ✓ Навошта ў Старажытным Егіпце захоўвалі целы памерлых?

10) Параўнанне рэлігійных уяўленняў першабытных людзей і старажытных егіпцян

- ✓ У чым вы бачыце падабенствы і адрозненні?
- ✓ Ці можна назваць рэлігію старажытных егіпцян мнагабожжам? Чаму?

**V. Замацаванне**

***Прыем «Чыстая дошка»***

- ✓ Якія багі найбольш за ўсіх шанаваліся ў Егіпце?
- ✓ Што такое храм?
- ✓ Чаму пустыню Сахару егіпцяне ўяўлялі ў выглядзе злога бога Сета?
- ✓ Чаму егіпцяне пакланяліся Нілу як богу?
- ✓ За што яны шанавалі кошку?
- ✓ Што з'яўлялася важнейшым месцам храма?

- ✓ Якія падарункі прыносілі багам?
- ✓ Навошта егіпцяне захоўвалі целы памерлых?

**VI. Рэфлексія**

***Прыем «Эмоцыя»***

Выбраць картку і прымацаваць на дошцы:

**!** – урок спадабаўся;

**!?** – урок спадабаўся, але не ўсё зразумела;

**?** – не зразумеў тэму.

**VII. Дамашняе заданне: пар. 13.**